(/ru/component/banners/click/14)
(/ru/component/banners/click/10)

Бярэзінская ПАНАРАМА

(/ru/component/banners/click/173)

25 ФЕВРАЛЯ 2024 ГОДА ЕДИНЫЙ ДЕНЬ ГОЛОСОВАНИЯ (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/tag/Единый%20день%20голосования)

г. Березино, ул. Комсомольская, 27 (https://goo.gl/maps/iLC97P4ykwK8qoZZ9)
gazeta@b-panoram.by (mailto:gazeta@b-panoram.by)
+375-1715-6-92-71 (tel:+375171563217)



# Як адносяцца бярэзінцы да новага свята – Дня бацькі?

18.10.2022 redaktor1 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/user/365-redaktor1) 295




**На нашым календары з'явілася новае свята – Дзень бацькі. У адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі яно будзе адзначацца 21 кастрычніка.**

Гэта стала выдатнай нагодай распытаць бярэзінцаў пра новае свята, бацькоўскае выхаванне і спрадвечныя сямейныя каштоўнасці.

## Сяргей Вальчэўскі, дырэктар фізкультурна-аздараўленчага цэнтра “Лазурный”



– Цяпер шмат розных святаў – няхай будзе і гэтае. Сапраўды, бацька не апошнюю ролю адыгрывае ў працэсе з'яўлення дзіцяці на свет і яго выхаванні. Хоць, як па мне, дык не ад таго, ёсць такое свята ці няма, залежыць значнасць ролі бацькі. Я і без гэтага ведаю, як мае трое дзяцей ставяцца да мяне, і яны пра мяне – таксама. Ад таго, ці ёсць у календары гэты дзень, нашы адносіны не зменяцца. Адзінае, што мяне па-сапраўднаму радуе, што цяпер мы з жанчынамі будзем мець роўную колькасць дзяржаўных святаў. Вось у прадстаўніц прыгожай паловы чалавецтва на календары значацца Міжнародны жаночы дзень і дзень матулі, а ў нас да гэтага года быў толькі Дзень абаронцаў Айчыны.

## Уладзімір Мацкевіч, супрацоўнік РАУС:




– Думаю, што Дзень бацькі ў нашым грамадстве будзе не лішнім. Гаворачы пра гендарную няроўнасць, мы звычайна маем на ўвазе парушэнне правоў жанчын, хоць на самой справе цяпер у мужчын іх куды менш, асабліва замацаваных на заканадаўчым узроўні. Добра, што ў Працоўным кодэксе з'явілася права для мужчын на водпуск у сувязі з нараджэннем дзіцяці – шкада толькі, што не аплочваемы, і бацьку трэба выбіраць: зарабляць грошы для сям'і ці пабыць у самыя важныя і складаныя дні разам з жонкай і нованароджаным дзіцем.

Тата ў мяне выдатны і аўтарытэтны чалавек, які годна прайшоў праз выпрабаванні афганскай вайны і ўдзельнічаў у ліквідацыі наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Ён навучыў мяне з малых гадоў упраўляцца з любой вясковай працай, усё рабіць сваімі рукамі – за гэта я вельмі ўдзячны. У маім дзяцінстве слова бацькі было законам, ды і я ў сваёй сям'і імкнуся да гэтага!

## Марына АЎЧАРЭНКА, работнік РКУВП “Бярэзінская ЖКГ”:



– Я нармальна стаўлюся да з’яўлення новага свята на нашым календары. Нам неабходна узнімаць ролю бацькі ў сям’і, бо ў выхаванні дзяцей без іх не абыйсціся. Некаторыя з мужчын, мне падаецца, па-сапраўднаму адчуваюць сябе бацькамі, калі ў іх з’яўляюцца ўнукі. З іх нараджэннем жыццё поўнасцю мяняецца. Гэта я гавару пра свайго свёкра, які і да мяне ставіўся са ўсёй душою. Часта гавораць, што ўнукаў любяць больш за дзяцей. Як, якой лінейкай ці прыборам можна вымераць велічыню бацькоўскай любові?

**Таццяна БУЛОЙЧЫК, намеснік дырэктара Бярэзінскай раённай комплекснай дзіцяча–юнацкай школы алімпійскага рэзерву:**




– Дзень бацькі даўно ўжо адзначаецца ў Расіі і іншых краінах свету. Галоўнае, каб бацька пры любых абставінах ім заставаўся. Вядома, што кожны ўкладвае ў паняцце «добры бацька» нешта сваё. Мы будуем узаемаадносіны ў сям'і не па нейкіх пісаных правілах, не па кніжках, а па агульных прынцыпах, якія выпрацаваліся з гадамі. Асабіста ў нашай сям'і без бацькі ніяк. Ён для дзяцей – сябар, дарадчык, аднадумца і вялікі аўтарытэт, а для мяне надзейная апора і каменная сценка ад усіх нягод. Мы падтрымліваем ў сям'і павагу адзін да аднаго і мяркуем, што і дзеці па нашым прыкладзе будуць будаваць свае сямейныя адносіны.

## Дзяніс Сямёнаў, вадзіцель:




– На жаль, я пакуль не бацька, але планую абавязкова ім стаць. Мужчына павінен пакінуць свой след на зямлі і працягнуць свой род. Таму да новага свята – Дня бацькі стаўлюся вельмі станоўча. Магчыма, яно надасць стымул нам стварыць сем'і і нараджаць дзяцей. Ведаю, што гэта зусім няпроста ў наш час, але на тое мы і мужчыны, каб не валяцца на канапе, а пераадольваць усе цяжкасці і несці адказнасць за сваіх любімых і дарагіх людзей. А яшчэ мне асабіста ўяўляецца, што гэты дзень не патрабуе ніякіх падарункаў. Трэба толькі зрабіць яго па магчымасці для ўсіх татаў выхадным! Паверце, мы самім зробім яго для дзяцей яркім і запамінальным!

**Мілана ТРАПЯНОК.**
**Фота Алены ГРОМАВАЙ.**

**Источник: redaktor1 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/user/365-redaktor1)**

Нашли ошибку? Выделите её и нажмите CTRL + ENTER

## Добавить комментарий

Другие материалы в этой категории: « Мелочь или событие? Как посмотреть... (/ru/novosti/aktualnye-novosti/item/14877-meloch-ili-sobytie-kak-posmotret) МЧС – за безопасность детей и стариков » (/ru/novosti/aktualnye-novosti/item/14881-mchs-za-bezopasnost-detej-i-starikov)

**Лента новостей**

Обман на ажиотаже (/ru/novosti/proisshestviya/item/23880-obman-na-azhiotazhe)

07.12.2023

Заседание постоянно действующей комиссии по координации работы по содействию занятости населения (/ru/novosti/ofitsialno/item/23879-zasedanie-postoyanno-dejstvuyushchej-komissii-po-koordinatsii-raboty-po-sodejstviyu-zanyatosti-naseleniya)

07.12.2023

Они спасают планету. Одни – на словах, другие – на деле (/ru/novosti/vazhnoe/item/23878-oni-spasayut-planetu-odni-na-slovakh-drugie-na-dele)

07.12.2023

Альтернатива магазину - автолавка (/ru/novosti/obshchestvo/item/23877-alternativa-magazinu-avtolavka)

07.12.2023

Дело палача Хатыни Катрюка готовится к передаче в суд (/ru/novosti/vazhnoe/item/23876-delo-palacha-khatyni-katryuka-gotovitsya-k-peredache-v-sud)

07.12.2023

Все Новости (/ru/novosti)

## Подписка




(http://www.berezino.by/padpisnaya-kampaniya/)

## Календарь

« (/index.php?option=com_k2&view=itemlist&task=calendar&month=11&year=2023&Itemid=807)

| Пн | Вт | |
|---|---|---|
| | | |
| 4 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/date/2023/12/4) | 5 (/ru/sotsialnaya-reklama/itemlist/date/2023/12/5) | 6 (/ru/s reklama/itemlis |
| 11 | 12 | |
| 18 | 19 | |
| 25 | 26 | |

© 2021 Березино. Березинский район. Березинская панорама. Все права защищены. Разработка: Группа компаний "ЦВР-Октябрьский"

(/ru/component/banners/click/14) (/ru/component/banners/click/10) (/ru/component/banners/click/12) (/ru/component/banners/click/15)

(/ru/component/banners/click/186) (/ru/component/banners/click/185)

242 (https://metrika.yandex.ru/stat/?id=87748660&from=informer)